

ПІСЬМО ДЗЕДУ МАРОЗУ 13

НАДВОР'Е: МОКРА І СЛІЗКА 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

15 СНЕЖНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 243 (30123)

КОРАТКА

- Беларусь можа стаць паўнапраўным членам ШАС у ліпені 2024 года.
- **Паміж Мінскам і Ніжнім Ноўгарадам аднаўлены прамыя чыгуначныя зносіны.**
- На базе ААТ «Камволь» адкрылі цэнтр кампетэнцый.
- **ЕАБР: тэмпы эканамічнага росту Беларусі ў 2023 годзе наблізяцца да 4 працэнтаў.**
- У Беларусі з пачатку 2023 года зафіксавана 15,7 тысячы кіберзлачынстваў.
- **У Жлобінскую лесапаляўнічую гаспадарку завезлі 17 ланяў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ВАСІЛЬЕЎ, намеснік старшыні Следчага камітэта:**

*«Напярэдадні буйной электаральнай кампаніі хацеў бы звярнуць увагу грамадскасці: усе следчыя падраздзяленні знаходзяцца ў пастаяннай гатоўнасці да рэагавання на любыя спробы сарваць выбарчы працэс або ўмяшацца ў яго. Безумоўна, злачынцы, якія знаходзяцца за мяжой, будуць імкнуцца знайсці ў Беларусі тых, хто будзе гатовы рэалізоўваць іх гнюсныя правакацыі. Памятайце: экстрэмісты, якія знаходзяцца ў Польшчы і Літве, за гэта атрымаюць грашовыя гранты, а схіленыя да злачынства жыхары Беларусі — крымінальную адказнасць. Не дайце ўцягнуць сябе ў тэрарыстычную дзейнасць!»*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Галоўнае — не дапусціць рэалізацыі сцэнарыяў, якія спрабуюць нам навязаць звонку»

## Ролю спецслужбаў як залог спакою ў «агульным доме» абмеркавалі ў Прэзідэнта

**На гэтым тыдні ў Мінску праходзіць XIX пасяджэнне Нарады кіраўнікоў органаў бяспекі і разведвальных служб дзяржаў — удзельніц СНД. Падобныя сустрэчы нязменна знаходзяцца ў полі зроку вышэйшага кіраўніцтва краін-удзельніц. Гэтая Нарада выключэннем не стала. З яе удзельнікамі сустрэўся Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БелТА.

### ВЫСТАЯЦЬ У СУСВЕТНЫМ ХАОСЕ

Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, сімвалічна, што ў эпоху войнаў і палітычных катаклізмаў цяперашняя Нарада праходзіць у Беларусі. «Нягледзячы на палітычны і санкцыйны ціск з боку Захаду, найперш ЗША, мы працягваем развіваць мірную стабільную дзяржаву, заснаваную на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці. Запыт на справядлівасць вялікі цяпер у нашых дзяржавах. Але, на жаль, сітуацыя вакол нас не становіцца больш бяспечнай. Расце напружанасць у розных рэгіёнах планеты. Некаторыя канфлікты, якія тлелі, пераходзяць у гарачую фазу, паўсюдна разварочваецца гібрыдныя проксі-войны. І не толькі проксі», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння поўнасцю дэградавалі міжнародныя структуры ад АБСЕ і Арганізацыі па забароне хімічнай зброі да Міжнароднай арганізацыі Чырвонага Крыжа. Па яго словах, яны ператварыліся ў пляцоўкі для дэмагогіі і інструменты для абслугоўвання і рэалізацыі інтарэсаў глабальных гульцоў. «Пры гэтым трацім вялізныя грошы на рознага роду канферэнцыі, разумеючы, што яны нічога не дадуць. Апошняя ў Дубаі прайшла. Дакаціліся да абсурду: Еўрапейскі фонд міру выдзяляе сродкі на вайну ва Украіне», — пералічыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што свет паглыбляецца ў хаос з непрадказальнымі наступствамі. Знайсці хоць якую раўнавагу пакуль не атрымліваецца. Разбурана сістэма процівагаў, збалансаваная раней узаемадапаўняльнымі дагаворамі, у тым ліку ў сферы ядзернага стрымлівання. «Абсалютна падтрымліваю меркаванне першага Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева, які нядаўна сказаў, што як ніколі свет блізкі да ядзернай вайны. Каму-каму, а яму трэба верыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што ў такіх умовах узрастае роля спецыяльных службаў, найважнейшай задачай якіх з'яўляецца забеспячэнне абароны сваіх дзяржаў і грамадзян ад унутраных і знешніх пагроз.

СТАР. 2

Перадсвяточнае

# КУПІЦЬ ЕЛКУ, КАБ ПАСТАВІЦЬ ЁЛКУ

## Ёлачныя кірмашы стартуюць у гэтыя выхадныя

**Напярэдадні калядных і навагодніх свят лясныя гаспадарчыя ўстановы краіны традыцыйна запрашаюць нашых людзей наведаць ёлачныя кірмашы. Сёлета навагоднія дрэвы, выгадаваныя спецыялістамі лясгасаў, можна будзе набыць ва ўсіх рэгіёнах краіны.**



Колькі ўсяго навагодніх дрэў плануюць рэалізаваць лесагаспадарчыя ўстановы? Якія акцыі пройдуць па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі ў краіне? Якое навагодняе дрэва рэкамендуюць набыць спецыялісты і дзе яго можна будзе купіць «танней»? Пра гэта расказалі ў Мінлясгасе.

### Два тыдні актыўнага гандлю — елак хопіць усім

Навагоднюю прадукцыю ад лясгасаў можна будзе купіць больш чым на тысячы ста гандлёвых пляцовак, расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Віталь БАНДАРЭВІЧ**.

Ён адзначыў, што напярэдадні калядных і навагодніх свят Мінлясгас шмат чаго зрабіў для забеспячэння нашых грамадзян святочнай прадукцыяй, атрыбутыкай, сувенірамі. Гандлёвыя пляцоўкі розныя. «Так, у лясніцтве мы зможам набыць толькі дрэвы, а на гандлёвых пляцоўках сеткі «Лясны домік» — не толькі елкі або хвоі, але і аксесуары да свята. Усе гэтыя рэчы прадугледжаныя ў вялікай колькасці, хопіць усім», — запэўніў спецыяліст.

СТАР. 3

Працяг тэмы

# ДУША ВЁСКІ,

## або Чаму важна захаваць стары яблыневы сад?

**Год таму на старонках нашай газеты («Звязда» ад 29.09.2022 г.) выходзіў матэрыял пад назвай «Цудоўны Сад». Гаворка ў ім ішла пра стары яблыневы сад у Вялікім Запруддзі Валожынскага раёна, які неабыякавыя вяскоўцы спрабуюць выратаваць ад выкарчоўвання. Каб захаваць, як яны кажуць «душу вёскі», маладыя людзі стварылі сельскагаспадарчы кааператыў «Цудоўны Сад» і звярнуліся ў райвыканкам з просьбай даць ім яго ў доўгатэрміновую арэнду для садаводства і ажыццяўлення крэатыўных ідэй. На момант той публікацыі мясцовыя ўлады далі вусны дазвол карыстацца зямлёй сада на год, каб праверыць сур'ёзнасць іх намераў. Гэтым летам старшыня Валожынскага райвыканкама працягнуў дазвол на часовае карыстанне яшчэ на год, але ўжо ў пісьмовай форме... Як складзецца далейшы лёс вясковага сада, пакажа час... А пакуль мы пацікавіліся ў спецыялістаў: наогул наколькі мэтазгодна яго захоўваць і развіваць? Што гэта дасць нашай краіне, прыродзе, людзям?**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «Галоўнае — не дапусціць рэалізацыі сцэнарыяў, якія спрабуюць нам навязаць звонку»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Гэта не банальныя і дзяжурныя выразы аб узрастанні вашай ролі ў сучасным свеце. Справа ў тым, што дзярждэпартаменты і Міністэрства замежных спраў апошнім часам крыху падразбураваць усталёўваць кантакты, а галоўнае — падтрымліваць іх нават у самых складаных абставінах. Спецслужбы ўмеюць гэта рабіць. І тут ад вас патрабуецца найжорсткае напружанне, каб не згубіць гэтую ніць, гэтую сувязь. Парвецца яна паміж вамі — не будзе з кім размаўляць і не будзе каму. Я гэта ведаю з уласнага досведу», — адзначыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што сёння асаблівае значэнне набывае эфектыўнасць дзейнасці знешняй разведкі па здабыванні дакладнай, актуальнай і перш за ўсё прагнознай інфармацыі, якая дазваляе кіраўнікам краін прымаць вывераныя рашэнні ў інтарэсах сваіх народаў. «Галоўнае тут — апярэдзіць нашых апанентаў, не дапусціць рэалізацыі тых сцэнарыяў, якія спрабуюць нам навязаць звонку, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Як мне дакладваюць (можа быць, у вас іншая інфармацыя), адна з асноўных задач разведсупольнасці НАТА і іх саюзнікаў — дэзынтэграцыя постсавецкай прасторы. Яны жадаюць спачатку ўбіць клін у нашы з вамі шматвяковыя добрасуседскія адносіны, а затым нацкаваць адзін на аднаго. Мы гэта праходзілі. Упэўнены, калі не будзе магчымасці зняць трубку і набраць па тэлефоне кожнаму з вас для вырашэння канкрэтнага пытання, гэта можа абярнуцца трагедыяй. Такога дапусціць нельга. Таму я заклікаю вас да таго, каб вы ні ў якім выпадку не разрывалі свае адносіны. Нават калі хтосьці з нашых дзяржаў будзе прытрымлівацца іншага пункту гледжання, палітыкі, якую тая ці іншая дзяржава сёння ажыццяўляе. Галоўнае — не спяшайцеся».

## МЫ ПАДТРЫМЛІВАЛІ І БУДЗЕМ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ СВАЙГО САЮЗНІКА

Прэзідэнт падкрэсліў, што назіраецца актыўнасць замежных спецслужбаў на нашай тэрыторыі. Па яго словах, формы іх працы набываюць усё больш агрэсіўны характар. «Да нас закідваюць не проста шпіёнаў, а ўжо агентаў-тэрарыстаў. Спрабуюць ствараць экстрэмісцкія ячэйкі, фарміруюць нейкія палкі з нашых збеглых, прыцягваюць наймітаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што сумесна з калегамі з Расійскай Федэрацыі затрымана ўжо каля двух дзясяткаў груп, якія мелі на мэце перш за ўсё тэрарыстычныя аперацыі на тэрыторыі Расіі. «Мы што ім павінны? Мы НАТА што павінны? Мы ціха-спакойна жывём, нікому не перашкаджаем. Я нядаўна размаўляў з вашымі калегамі з тых вядучых краін — кіраўнікамі спецслужбаў. Я ім задаваў прамое пытанне: «Вы чаго ад нас хочаце? Вы, што, не ведалі, што мы з Расіяй заключылі дагавор, што ў нас самае блізкае ваенна-палітычнае супрацоўніцтва?» «Вось вы там дапамагаеце Расіі»... Я кажу: «Дапамагалі і будзем дапамагаць. Мы гэта шчыра гаворым, мы гэта ніколі не хавалі». Гэта наш саюзнік, пачынаючы ад тых часоў, калі я сказаў, што мы ў спіну рускім страляць не дазволім праз тэрыторыю Беларусі, мы гэтага прынцыпу прытрымліваемся. Што тут не было ясна да канфлікту ва Украіне? Усё было ясна і зразумела, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — А я ім задаю пытанне: «А вы, 50 краін, падтрымліваеце сёння Украіну?..» Даўно ўжо гэта вайна пераўтварылася з расійскага канфлікту з Украінай у вайну Расіі супраць усяго «цывілізаванага Захаду». Вы ведаеце, не адмаўляюць. А тады чаго ад нас хочаце? Мы падтрымлівалі і будзем падтрымліваць свайго саюзніка. Гэтаксама як і ўсе дзяржавы, якія сядзяць за гэтым сталом», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама прывёў у прыклад, як Беларусь і Расія імгненна адрэагавалі, калі ў пачатку 2022 года здарыўся канфлікт у Казахстане, які стараліся падагрэць з-за мяжы.

«Да нас прэтэнзіі прад'яўляць не трэба. У нас палітыка транспарэнтная, адкрытая. І мы заўсёды будзем прытрымлівацца такой палітыкі, каб вы ведалі. Мы ад вас нічога не ўтойваем, кажу гэта публічна», — заявіў беларускі лідар, яшчэ раз зрабіўшы акцэнт на тым, што такая палітыка будзе праводзіцца і далей.

«Мы бачым вельмі сур'ёзную актыўнасць на тэрыторыі Беларусі. Зразумела, што гэта санітарны кардон на тысячу кіламетраў, акно атрымалася, «акно», «балкон» — хто як называе Беларусь. Зразумела, што будуць пастаянна яго імкнуцца абрэзаць, каб выйсці туды праз Смаленск, як заўсёды, да Масквы. Шчыра кажу: гэтага дазволіць мы не можам. Мы будзем усяляк са сваімі саюзнікамі прытрымлівацца гэтай лініі», — дадаў беларускі лідар.

## МЫ НЕ ХОЧАМ ВАЯВАЦЬ. ТРЭБА ТРЫМАЦЬ ЭКАНОМІКУ

Сведчаннем таму, што нас не пакінуць у спакоі, кіраўнік дзяржавы назваў рэзанансныя акцыі ў Мачулішчах, калі спрабавалі напасці на ваенны аэрадром і знішчыць перш за ўсё расійскую ваенную тэхніку; у Гродне; спробы падрыву чыгункі ў розных рэгіёнах краіны. Прэзідэнт звярнуў увагу, што цяпер сур'ёзныя пагрозы сфарміраваліся для нас і ў інфармацыйнай сферы. Ён падкрэсліў, што сёння журналісты і ідэолагі, якія знаходзяцца на перадавой, адбіваюць гэтыя атакі. Гэта і дэструктыўнае ўздзеянне на насельніцтва, і распаўсюджванне фэйкаў, укідаў, і кібератакі на крытычную інфраструктуру дзяржаўных органаў. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што вельмі важна сёння не дапусціць перарастання гэтай інфармацыйнай вайны, гэтага супрацьдзеяння ў «гарачую» вайну.

«Нельга дапусціць бойкі у нашым доме. Давайце перажывём гэтыя падзеі. Мы страцілі сваю дзяржаву, якая садзейнічала ўтрыманню шматпалярнага свету; згубілі, — звярнуўся Прэзідэнт да прадстаўнікоў краін СНД. — Не такія мы сёння моцныя, як раней. Таму нам супрацьстаяць гэтым схваткам у раёне Ціхага акіяна, Індыйскага, Атлантыкі вельмі складана. Проста па-жыццёваму вам кажу са свайго досведу: нам трэба гэта перажыць. Мы не хочам ваяваць, мы наваяваліся, хопіць. Трэба эканоміку трымаць нашу. Калі не будзе ўнутраных прычын — ніхто да нас не палезе. А ўнутраныя прычыны — гэта эканоміка». У сувязі з гэтым ён падкрэсліў, што і краінам — удзельніцам СНД трэба не дапусціць разарвання сувязяў паміж сабой. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў Украіну, кіраўніцтва якой заклікаў не спяшацца выходзіць са складу СНД. Падобная размова была ў свой час і з колішнім прэзідэнтам Грузіі Міхаілам Саакашвілі. Па словах беларускага лідара, выйсці з міжнароднай структуры проста, але вярнуцца назад — ужо складана.

Прэзідэнт падкрэсліў, што, толькі аб'яднаўшы намаганні, краіны — удзельніцы СНД змогуць супрацьстаяць розным пагрозам. «Характар даверных адносін паміж намі вызначаецца агульнай гісторыяй (яе ўжо не зменіш), якая дасталася ад некалі адзінай краіны, эканамічным, навуковым, адукацыйным патэнцыялам, міжчалавечымі кантактамі. Вось гэта наша эканамічная прастора. Так, многае тут залежыць ад Расіі. Але давайце шчыра казаць: Расія кожны месяц, кожны год іншай становіцца. Як ніколі, сёння ў сілу пэўных умоў Расія з'яўляецца цэментавальным, аб'яднальным звяном постсавецкай прасторы», — сказаў беларускі лідар. Ён заклікаў захоўваць адзіную эканамічную прастору, агульны рынак.

## ТРЭБА ДАМАЎЛЯЦЦА. ГЭТАЯ АГІДНАЯ СІТУАЦЫЯ НІКОМУ НЕ ПАТРЭБНА

У прыклад, што бывае, калі не прытрымліваешся названых прынцыпаў, Прэзідэнт прывёў канфлікт ва Украіне. Па яго словах, украінцы правакавалі расійскі бок на канфлікт, у тым ліку дыскрымінуючы ва Украіне грамадзян па нацыянальнай прыкмеце. «У Расіі Пуціна штурхалі да таго, каб ён абараніў сваіх людзей. А як ён павінен быў паступіць? Даскакаліся, значыць», — адзначыў

Прэзідэнт звярнуў увагу на канфлікт Уладзіміра Зяленскага з украінскімі ваеннымі. Пра ўнутрыпалітычную сітуацыю ва Украіне Аляксандр Лукашэнка расказваў яшчэ некалькі месяцаў таму на сустрэчах з замежнымі і беларускімі журналістамі. Тады ён адзначаў, што аб міры трэба дамаўляцца найперш з украінскімі ваеннымі,

дасталіся ў спадчыну ад папярэднікаў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што заклікаў вырашыць канфлікт мірна, для гэтага разглядаліся канкрэтныя меры, якія так і не былі прыняты. А цяпер і Арменіі, і Азербайджану прыходзіцца цяжка.

Няпростая сітуацыя гістарычна склалася і на таджыкска-кыргызскай граніцы.



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што кіраўнікі спецслужбаў заўсёды пытаюцца аб прычынах канфлікту. «Амерыканцу задаў пытанне: «А калі б у Мексіцы так сябе паводзілі супраць амерыканскіх грамадзян?» Амерыка раздушыла б ужо гэтую Мексіку», — сказаў беларускі лідар. Ён заўважыў, што ў гэтым канфлікце ўсімі бакамі дапушчана нямала памылак. Але для таго і існуюць палітыкі, каб своечасова спыніцца. А сёння ніхто не гатовы спыніцца. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сёння і Захад ужо канфліктуе з Украінай. «Папярэджваў Зяленскага: узнікне недзе заварушка або нейкая іншая прычына — пра цябе забудуцца. Вось, калі ласка: Блізкі Усход, унутраная сітуацыя ў Амерыцы. Што адбылося — ходзіць, небарака, з працягнутай рукой», — адзначыў ён. Беларускі лідар заявіў, што Злучаныя Штаты павялі сябе подла ў адносінах да ўкраінскага прэзідэнта. Ён нагадаў, што напярэдадні вайны амерыканцы абяцалі кіраўніцтву Украіны фінансаванне і пастаўкі зброі. А зараз нічога гэтага няма. Таму Уладзімір Зяленскі і патрабуе ад заходніх партнёраў выканання дамоўленасцяў.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, удзельнікам канфлікту трэба дамаўляцца: «Гэтая агідная сітуацыя нікому не патрэбна. І вы ведаеце, што сёння Расія гатова. І ніколі не адмаўлялася ад перагавораў. Тады Зяленскага стрымліваў Захад, цяпер яны ківаюць на Зяленскага: «Калі ён пагодзіцца на перагаворы, мы таксама гатовы». Узнікла новая сітуацыя — і кінулі. Як у Афганістане: будуць чапляцца за шасі і падаць на аэрадром».

бо яны кожны дзень гінуць на фронце і бачаць, што гэта такое насамрэч. «Ваенныя Украіны маюць адрозны пункт гледжання і пазіцыю ад палітыкаў і прэзідэнта Зяленскага. І Уладзімір Зяленскі гэта выдатна ведае. І будучыя перастаноўкі ў ваенным блоку гавораць пра гэта. Самыя прафесійныя ваенныя больш за ўсё перакананыя, што вайну трэба спыняць. Вы ўбачыце, што нам усё роўна — і расіянам найперш — прыйдзецца дамаўляцца з вайскоўцамі Украіны. І ніякія палітыкі, а вы бачыце, якія там палітыкі — са ўсяго свету сабралі «гаворачыя галовы». Гаварыць, ведаеце, — не справу рабіць. Гаварыць усе ўмеюць, а вось пайсці паваяваць на фронце ці хаця б туды з'ездзіць падчас бою — яны там не былі. Там жа кідаюць людзей як гарматнае мяса. І яны гатовыя «мільёнамі ўкраінцаў ахвяраваць» — цытата. Ваенныя гэта разумеюць. І ваенныя змогуць дамовіцца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён растлумачыў, што закрануў тэму ўкраінска-ваеннага канфлікту нездарма. «Лёгка пайсці, махнуць рукой, адарвацца. Вярнуцца потым будзе цяжка. Не рабіце гэтага. Ад вас многае залежыць. Так, дапусцілі недзе памылкі. Так, дзесьці не атрымалася — у Арменіі, Азербайджане. Давайце выправім гэта», — звярнуўся ён да кіраўнікоў спецслужбаў. Па словах беларускага лідара, эскалацыі армяна-азербайджанскага канфлікту не здарылася, калі б бакі своечасова прыслухаліся да парад і прынялі неабходныя меры. Ён заўважыў, што ў гэтым віна не цяперашняга кіраўніцтва Арменіі. Прэм'ер-міністру Ніколу Пашыняну гэтыя праблемы

Аднак лідарам гэтых дзяржаў удалося знайсці ўзаемапрымальнае рашэнне. «Я ўвесь час хвалю кіраўнікоў: ну проста малайцы. Больш як 90 працэнтаў граніц узгаднілі. І я ўпэўнены, што ў наступным годзе яны падпішуць дагавор аб граніцы, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Дзеля чаго мы ваюем? Жыццё ж аднойчы даецца».

Кіраўнік дзяржавы згадаў і беларускі прыклад: 2020 год, калі ў ціхай, спакойнай краіне спрабавалі развязаць бойку. Але, на шчасце, усё скончылася мірна. Падсумоўваючы вышэйсказанае, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што краінам, звязаным агульнай гісторыяй, трэба трымацца разам і падтрымліваць даверныя адносіны. «Ні ў якім разе не адрывайцеся, не ідзіце, таму што кінуць. А ў бяздольнага народа, які трапіў у цяжкую сітуацыю, тупік, выхад адзін: стрэльбу дадуць — ваюй», — рэзюмаваў ён. І супрацоўніцтва органаў бяспекі, па яго словах, з'яўляецца пляцоўкай, якая дае магчымасць лепш разумець інтарэсы адзін аднаго, улічваць іх і прымаць канкрэтныя меры па дээскалацыі абстаноўкі.

## БЕЛАРУСЫ КОЖНЫ РАЗ З ГОНАРАМ ВЫТРЫМЛІВАЛІ НАЦІСК

Дырэктар Службы знешняй разведкі Расіі Сяргей Нарышкін падзякаваў беларускаму лідару за магчымасць правесці чарговае пасяджэнне Нарады кіраўнікоў органаў бяспекі і разведвальных служб СНД у Мінску. У адказ Аляксандр Лукашэнка заявіў аб гатоўнасці беларускага боку

даваць пляцоўкі для такіх сустрэч.

Сяргей Нарышкін расказаў, што пасяджэнне Нарады ў Мінску прысвечана тэматыцы пашырэння супрацоўніцтва органаў бяспекі і разведслужбаў «у мэтах блакіраваць намаганні Захаду па дэстабілізацыі абстаноўкі» на прасторы Садружнасці. «Беларусь неаднаразова адчувала на сабе непрыкрытую агрэсію з боку заходняга блока на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі, якім, напэўна, ненавісны такі бескампрамісны курс Мінска адстойваць свае інтарэсы, інтарэсы сваёй дзяржавы і грамадзян. Беларуская ўлада і грамадства кожны раз з гонарам вытрымлівалі гэтыя націск і даказвалі, што ціску з боку еўраатлантычнага блока трэба і можна супрацьстаяць», — заявіў ён. Па словах кіраўніка СЗР Расіі, Захад не пакідае звычкі груба ўмешвацца ў справы краін — удзельніц СНД, каб іх раз'яднаць, пазбавіць палітычнай волі і эканамічнага патэнцыялу, не дапусціць фарміравання ў Еўразіі альтэрнатыўнага цэнтра сілы, здольнага кінуць выклік заходняй гегемоніі. «Не маючы магчымасці дзейнічаць напрамую, шляхам так званых гуманітарных інтэрвенцый, заходні блок выкарыстоўвае метад гібрыднай вайны, які закранае ўсе бакі, усе сферы жыцця дзяржавы і грамадства. Асаблівую трывогу ў нас цяпер выклікаюць спробы заходняга блока падарваць сістэмы ўлады на прасторы Садружнасці шляхам распальвання этна-сепаратысцкіх і ксенафобскіх настрояў», — сказаў Сяргей Нарышкін.

Па яго словах, асабліва паказальна, што нацыяналрадыкальны парадак дня заўсёды ідзе поплеч з прозаходнім, і антырасійскім, і антыкітайскім. «Такі вось вырбарчы шавінізм атрымліваецца», — заўважыў кіраўнік СЗР Расіі. Сяргей Нарышкін нагадаў, што менавіта пад такімі лозунгамі англасаксы дзесяцігоддзямі праводзілі каланізацыю Украіны, вынікам якой стала цяперашняя трагедыя ўкраінскага народа і грамадства.

«Усё вышэйпералічанае — сучасная праява такой класічнай максімы англасаксаў, якая гучыць як «падзяляй і пануй». Адказам на гэтую разбуральную стратэгію можа быць толькі супрацьлеглы прынцып, які яшчэ ў XIX стагоддзі быў сфармуляваны адным еўрапейскім мысляром, і гучыць ён — «аб'ядноўвай і вядзі». Размова ідзе не толькі аб павышэнні ўнутранай кансалідацыі грамадства і кожнай дзяржавы нашай Садружнасці. Не менш важна пашыраць і ўзмацняць знешнепалітычную каардынацыю паміж нашымі дзяржавамі, у тым ліку і ў сферы рэагавання на дэструктыўную заходнюю актыўнасць у адносінах да нашых краін і Садружнасці ў цэлым», — заявіў Сяргей Нарышкін.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **У тэму**

## НАША АДЗІНАЯ ПАЗІЦЫЯ — ПРАВІЛЬНАЯ

У размове з журналістамі Сяргей Нарышкін падвёў вынікі нарады. «Аляксандр Рыгоравіч даў вельмі карысныя палітычныя парады, як дзейнічаць у цяперашняй вельмі няпростай абстаноўцы, калі заходні блок злоўжывае сваім становішчам і спрабуе дэстабілізаваць сітуацыю ў нашых краінах, раз'ядаць, развесці краіны Садружнасці па сваіх «кватэрах». Але мы не паддаёмся і не будзем паддавацца. Мы разумеем, што наша адзіная пазіцыя — правільная, і ў рамках Садружнасці агульная палітыка ў сферы гарантавання бяспекі і стабільнасці мае вялікае значэнне», — сказаў ён.

Сяргей Нарышкін расказаў, што інфармацыя, якая паступае ў СЗР, сведчыць аб тым, што заходні блок на чале з ЗША расцэньвае Расію і Беларусь як адзіны геапалітычны цэнтр сілы, які здольны супрацьстаяць знешнім пагрозам. «Шмат у чым гэта здольнасць Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі даволі паспяхова і паслядоўна развівацца ва ўмовах няспрыяльнай знешняй абстаноўкі звязана якраз з дзейнасцю спецслужбаў, у тым ліку КДБ Беларусі і СЗР Расіі», — сказаў ён. Па словах дырэктара СЗР, у фокусе ўвагі спецслужбаў абедзвюх дзяржаў знаходзяцца і тыя выклікі і пагрозы, якія зыходзяць ад групы «таталітарна-ліберальных» рэжымаў Захаду. Адносіны спецслужбаў Беларусі і Расіі Сяргей Нарышкін ахарактарызаваў як даверныя, падкрэсліўшы таксама іх сістэмны характар і поўную падтрымку лідараў дзвюх краін.

**Намеснік старшыні Кабінета міністраў — старшыня Дзяржаўнага камітэта нацыянальнай бяспекі Кыргызстана Камчыбек ТАШЫЕЎ** звярнуў увагу, што ва ўмовах, калі абстаноўка ў свеце хутка мяняецца, трэба не дапусціць разладу паміж краінамі — удзельніцамі СНД. «Краіны СНД павінны выступаць адзіным фронтам па ўсіх пытаннях, асабліва па пытаннях гарантавання бяспекі нашых краін», — сказаў ён.

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта нацыянальнай бяспекі Таджыкістана Саймумін ЯЦІМАЎ** расказаў, што асноўны прадмет Нарады кіраўнікоў органаў бяспекі і разведвальных служб — барацьба з падрыўной дзейнасцю сапернікаў і з тэрарыстычнымі арганізацыямі і праявамі. «Перакананы, што мы павінны адыходзіць ад закасцянелага дагматызму, які разглядае падрыўную дзейнасць, тэрарыстычную актыўнасць як нешта аўтаномнае, асобнае», — сказаў ён. Па словах Саймуміна Яцімава, задача разведкі і контрразведкі ў тым, каб дайсці да сутнасці праяў тэрарызму, выявіць вызначальнае і заканамернае, знайсці тых, хто ініцыіруе, субсідзіруе, арганізоўвае, плануе, рэалізоўвае мерапрыемствы тэрарыстычнай накіраванасці.

# КУПІЦЬ ЕЛКУ, КАБ ПАСТАВІЦЬ ЁЛКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, толькі жывых елак і хвоек плануюць нарыхтаваць больш за 140 тысяч штук. Зрэшты, апошняе слова за попытам. А ён расце на дрэвы ў кадках, якія можна купіць ужо цяпер, навагоднія вянкі і букеты. Прапануюць некаторыя лягсасы і драўляныя складаныя елкі (з дошчачак), якія могуць разбірацца пасля святаў, доўга захоўваюць свой знешні выгляд, перадаюць водар лесу. Рэспубліканскі лягсасы селекцыйна-насенняводчы цэнтр, у прыватнасці, рэалізуе, апроч іншага, натуральныя ўпрыгожванні на ёлку з фарбаваных шышак.

Па традыцыі лягсасы імкнуцца размясціць свае пункты продажу бліжэй да пакупнікоў. Па просьбе грамадзян, зыходзячы з попыту, міністэрства павялічыла колькасць гандлёвых пляцовак. «Сёлета, у прыватнасці, узгаднілі 12 дадатковых пунктаў у Мінску, каб забяспечыць насельніцтва сімваламі свята па прымальных цэнах, — звярнуў увагу Валерый Бандарэвіч. — Дарэчы, ва ўсіх абласных цэнтрах будзе працаваць больш за 80 нашых гандлёвых пляцовак».

Ён адзначыў, што цэны на навагоднія дрэвы пастараліся захаваць на ўзроўні мінулага года. Набыць пушыстую прыгажуню можна ў лягсасах па досыць прымальных цэнах. Ялінка вышынёй да метра — у сярэднім будзе каштаваць ад 5 да 5,5 рубля, да 1,5 метра — да 10 рублёў, звыш 1,5 метра — да 15 рублёў. «Пры гэтым трэба ўлічваць спецыфіку рэгіёнаў, у залежнасці ад яе кошт можа адрозніваться. Актуальныя лічбы варта ўдакладняць на сайтах лягсасаў або звяртацца да нас, мы размесцім цэны, каб грамадзяне арыентаваліся», — падкрэсліў Віталь Бандарэвіч.

### Каб яна не абсыпалася

Першае, што трэба зрабіць, гэта вызначыцца з датай, калі ж навагодняе дрэўца нам спатрэбіцца, ужо прыгожае і прыбранае. Наш эксперт рэкамендуе ўстанаўліваць дрэўца не раней чым за 5—10 дзён да ўрачыстасці.

Зрэзаная елка пачынае засыхаць толькі з таго моманту, як яна трапляе ў цяпло і пачынаецца працэс «высушвання», выпарэння вільгаці з іголак, таму пасля ўстаноўкі елкі трэба забяспечыць ёй рэгулярнае паступленне вады да ствала і прахалоднае, вільготнае паветра.

Месца для ёлкі падыдзе як мага далей ад адкрытага агню, электраабагравальнікаў, радыятараў і іншых крыніц цяпла. Вельмі добра, калі памяшканне часам будзе праветрывацца, каб трохі паніжаць тэмпературу, а паветра — рэгулярна ўвільгатняцца.

Асобна варта згадаць пра тое, што калі на вуліцы моцны мароз ніжэй за мінус 15 градусаў, то іголкі і галінкі становяцца вельмі далікатнымі і іх лёгка пашкодзіць. Пры такім надвор'і і спецыялісты не рэкамендуюць лішні раз трывожыць галінкі елкі адразу пасля таго, як яе прынеслі дадому. Лепш пачакаць, пакуль дрэва паступова адаптуецца да пакаёвай тэмпературы, і толькі потым ставіць.

Наступнае, што трэба зрабіць — гэта забяспечыць рэгулярнае паступленне вады да ствала. Каб дрэўца лепш убірала ваду, ствол спілоўваюць на 2-3 сантыметры ад зруба або надсякаюць нажом — для фарміравання свежага зрэзу і большай плошчы ўбірання вільгаці.

Можна выкарыстоўваць спецыяльныя падстаўкі для елкі з рэзервуарамі для вады. У іх елка надзейна і хутка фіксуецца ў патрэбным становішчы, а ваду лёгка падліваць па меры выпарэння. А яшчэ эксперт раіць ваду падсаладзіць.

Чым вышэй тэмпература паветра ў памяшканні, тым раней пачне абсыпацца зрэзаная елка. Пры тэмпературы 10 градусаў вышэй за нуль навагодняе дрэва будзе стаяць доўга, да месяца. Але зімой у нашых кватэрах даволі горача, а павышэнне тэмпературы на кожныя 5 градусаў памяншае працягласць жыцця ёлкі на 1 дзень. Гэта значыць, калі ў нас дома 28—30 градусаў, то пры ўсіх хітрыках елка прастаіць толькі некалькі дзён. Спецыялісты раяць рэгулярна праветрываць памяшканне, у якім стаіць елачка, для паніжэння тэмпературы паветра хоць на некалькі градусаў. Не варта таксама забываць пра тое, што электрычныя электраабагравальнікі моцна высушваюць паветра, таму іх лепш не выкарыстоўваць там, дзе стаіць жывое дрэва.

У першую чаргу яны будуць праводзіць інфармацыйна-тлумачальную работу з насельніцтвам — распавядаць аб парадку, месцах і тэрмінах набыцця дрэў. Акрамя таго, штодня будуць праходзіць палявыя мерапрыемствы з удзелам прадстаўнікоў іншых ведамстваў. У тым ліку будуць арганізаваны стацыянарныя пасты на аўтадарогах для праверкі аўтамабіляў на прадмет транспарціроўкі незаконна нарыхтаваных елак. Праверкі будуць і на спецыялізаваных кірмашах. Работнікі Мінлягсаса сумесна з прадстаўнікамі падатковых органаў будуць глядзець, наколькі законна набыты прадстаўленыя дрэвы, ці адпавядаюць яны заканаму віду і параметрам.

Аляксей Бойка звярнуў увагу на тое, што з кожным годам колькасць незаконных высечак жывых сімвалаў свята скарачаецца. Пры гэтым у мінулым годзе па выніках палявых мерапрыемстваў быў складзены 41 пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. Шкода, прычыненая незаконнай высечкай, склала больш за 900 рублёў.



### Сацыяльнае і камерцыйнае

Лягсасы прапануюць нашым людзям набыць навагоднія дрэвы ў кадках, гаршках або скрынках, захаваць іх да вясны і высадзіць у найбліжэйшым лясніцтве падчас акцыі «Тыдзень лесу». Такім чынам, кожны беларус зможа ўнесці свой уклад у азеляненне малой радзімы. А кожнаму пакупніку навагодняга дрэва ў кадцы лягсасы падораць памятку па доглядзе за сімвалам свята. Акрамя таго, у каго ёсць свой асобны дом або дача, могуць вясной высадзіць ялінку з кадкі ў сябе на ўчастку. Калі яна прыжывецца, то ўжо праз 3–5 гадоў вы зможаце ўпрыгожваць зімой сваю ўласную красуню.

Напярэдадні Новага года лесагаспадарчыя ўстановы акажуць дабрачынную дапамогу ўстановам дашкольнай і школьнай адукацыі і падораць ім жывыя атрыбуты свята. Для гэтага трэба, каб дзіцячыя садкі і школы зрабілі адпаведныя заказы.

### У лес — па законе

**Кансультант упраўлення лясной гаспадаркі Мінлягсаса Аляксей БОЙКА** адзначае, што ў бліжэйшыя выхадныя дарогі, якія вядуць да лесу, будуць пад узмоцненым наглядам. Работнікі лягсасаў і іх памочнікі будуць пільна сачыць за тым, каб ніхто ў гэты час з сякерай у руках незаконна па лесе не гуляў.

Напярэдадні зімовых свят Дзяржаўная лясная ахова будзе ажыццяўляць шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на спыненне незаконнага набыцця елак і соснаў. У прыватнасці, службовыя асобы дзяржлесаховы пераходзяць на ўзмоцнены рэжым працы.

А за незаконную высечку елак у прыродаахоўных, рэкрэацыйна-аздараўленчых і ахоўных лясах прадугледжаны штраф для фізічнай асобы ў памеры 5—30 базавых велічынь, у эксплуатацыйных лясах — у памеры да 20 базавых велічынь. Акрамя гэтага, яшчэ будзе налічана шкода, прычыненая навакольнаму асяроддзю. А таксама будзе неабходна выплаціць кошт ссечанага дрэва ў памеры адной базавай. Ці варта так рызыкаваць, калі цана дрэўца на ёлачным кірмашы абсалютна даступная.

Дарэчы, у дапамогу работнікам лясной аховы ў перыяд навагодніх свят — фотапасткі. Іх у сістэме Мінлягсаса каля 1,4 тысячы. Летась яны дапамаглі выявіць пяцярых парушальнікаў.

### Усё зробім самі

Дарэчы, а законна ссекчы навагоднюю ялінку ў лесе ўсё ж такі можна будзе. Для гэтага неабходна звярнуцца ў мясцовы лягсас (бліжэйшы да вашай рэгістрацыі) і аплаціць дрэва, якое вы жадаеце (елка, хвоя). Вам выдадуць дакумент для высечкі і адрас пляцоўкі, дзе вы будзеце шукаць тую адзіную вашу ялінку. Гэта так рамантычна, ды і значна танней. Ялінка з самастойным вывазам будзе каштаваць значна менш, чым такі ж тавар, але ўжо на кірмашах.

Для некаторых жыхароў нашай краіны гэтыя дзеянні — сямейная традыцыя. Бацькі так хочуць паказаць дзецям, як правільна сябе паводзіць у лесе, адкуль бяруцца дрэвы ў нашых дамах на Новы год. Калі ўсё зроблена дакладна і якасна, то такія дзеянні падтрымліваюць і прадстаўнікі Мінлягсаса.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Івану Міхайлавічу ЭЙСМАНТУ, старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Івану Міхайлавічу Эйсманту з прычыны вялікага гора, якое напаткала яго, — смерці БАЦЬКІ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Івану Міхайлавічу Эйсманту з прычыны вялікага гора, якое напаткала яго, — смерці БАЦЬКІ.**

# ДУША ВЁСКІ...



Неабыякавыя да лёсу сада вяскоўцы, а таксама мінчане, якія прыехалі адпачыць ад гарадскога тлуму, сабраліся ў выхадны дзень, каб папрацаваць у садзе. Сярод іх быў і Іван КАВАЛЕЎСКІ (ён прыехаў з сынам і ўнукамі), які не прызнае трымеры і дагэтуль дома косіць па старынцы. Перад тым як прыступіць да пакосу травы, Іван Іванавіч правёў майстар-клас па кляпанню касы.

## «Раю скарыстацца досведам Лошыцкага парку»

Як аказалася, у РУП «Інстытут пладаводства» чулі пра жаданне вяскоўцаў узяць на сябе адказнасць за сад у Вялікім Запруддзі. **Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела ягадных культур Юлія КАНДРАЦЁНАК** прывяла ў прыклад Лошыцкі парк, дзе ў свой час Інстытутам пладаводства былі закладзены калекцыйныя сады для сортавывучэння. Пасля таго як Інстытут перабазіраваўся ў Самахвалавічы, гарадскія ўлады змаглі не проста захаваць тыя яблыні, ігрушы, чарэшні, але і дагледзець. І цяпер гэта адно з самых папулярных месцаў адпачынку ў Мінску.

Ідэя захаваць стары вясковы сад, на думку маёй суразмоўніцы, даволі перспектыўная. «Яго можна зрабіць сапраўднай турыстычнай «разыначкай» Валожыншчыны. Выкарыстоўваць не толькі як пладовы сад, але і як месца для адпачынку, для правядзення мерапрыемстваў, вяселляў. Зараз маладыя людзі шукаюць менавіта такія арыгінальныя лакацыі. Паколькі гэта калгасны сад, там дакладна павінны быць каштоўныя, вельмі смачныя і карысныя старадаўнія сарты яблыкаў: «Антонаўка», «Белы наліў», «Пэпіны», «Шафран», «Сенат», «Штрыфель», «Каштэля», магчыма, «Ананас Бержаніцкага», «Ранет залаты курскі»... І гэта таксама можна падаць як камерцыйны складнік — «наведайце стары сад і пакаштуйце эксклюзіўныя сарты яблыкаў, якія вы не купіце на кірмашы».

— *Што яшчэ можна ім параіць?*

— У першую чаргу выбракаваць усе хворыя і паміраючыя дрэвы. Можна замовіць выезд спецыяліста з нашага Інстытута, які агледзіць сад і дасць сваё заключэнне, наколькі тую ці іншую яблыню мэтазгодна захаваць. У адносінах астатніх правесці мінімальную санітарную абрэзку, прыбраць засохлыя галіны. Вельмі важна максімальна захаваць прыродную прыгажосць старых яблынь — маляўнічыя крывыя галіны, выгінастыя фігурныя ствалы. Яны на сёння ўяўляюць вельмі вялікую эстэтычную каштоўнасць.

— *У членаў кааператыва ёсць ідэя на месцы яблынь, што загінулі, пасадзіць арэхі, ягадныя кусты, іншыя пладовыя і дэкаратыўныя дрэвы...*

— Калі ласка, галоўнае, каб гэтыя расліны спалучаліся. Бо калі пасадзіць ядловец казацкі, то саду прыйдзе канец, бо ён разносіць іржу груш. Таму да гэтага высокую якасць пладоў і нізкі ўзровень інфекцыйнага запасу хвароб (паршы яблыні), ад якіх сёння церпяць маладыя сады. На яе думку, пры правільным доглядзе сад яшчэ гадоў 30 будзе даваць смачныя плады ў вялікай колькасці. «З улікам прынятага ў нашай краіне закона аб арганічнай сельскай гаспадарцы і ўзрастаючым інтарэсе да экалагічнага земляробства такі праект будзе мець вялікае адукацыйнае значэнне для прасоўвання ідэй арганічнага і экалагічна арыентаванага пладаводства. Пладовы сад — шматгадовая гаспадарка, за сваё таксама трэба падыходзіць з розумам. Вельмі добра ў стары яблыневы сад упішуцца аронія, сартавая рабіна, глог, шыпшына, гардавіна, ці чорная дэкаратыўная каліна. З саджанцамі, дарэчы, мы можам дапамагчы, няхай звяртаюцца.

## «Пры правільным доглядзе ён яшчэ гадоў 30 будзе даваць смачныя яблыкі»

Аднаўленне старога сада важнае для нашай краіны не толькі з культурнага, але і з экалагічнага пункту гледжання. Так лічыць **спецыяліст па арганічным земляробстве і ўстойлівай сельскай гаспадарцы Вольга ШЧЫГЛІНСКАЯ.** Яна асабіста наведвала сад у Вялікім Запруддзі і, агледзеўшы яго, была прыемна ўражаная, што той, нягледзячы на паважны ўзрост і адсутнасць належнага догляду, у вельмі добрым стане, мае жыццё прыцягвае шмат шкоднікаў і тых, хто за імі палюе. Старыя кінутыя сады ўвогуле ўяўляюць сабой астравы біяразнастайнасці, гэткай рэзервацыі для дзікай прыроды пасярод сельскагаспадарчых угоддзяў. Шмат прыродных абаронцаў ураджаю адтуль разлятаюцца па палях».

Наведваў сад і вопытны ляснік, фермер, гаспадар вялікага лесасаду у Смалявіцкім раёне Васіль Семчанка. Менавіта ён вучыў членаў кааператыва правільна абразаць пладовыя дрэвы. Паводле яго слоў, сады савецкага часу экстэнсіўнага тыпу з глыбокай каранёвай сістэмай уяўляюць асаблівую каштоўнасць. У іх высаджаны тыя расліны, якія добра прыстасаваны да нашага клімату, глебы. Захоўваючы іх, мы захоўваем генафонд для нашых будучых садоў. Дарэчы, менш працаёмкіста захаваць новы сад унутры старога. Хоць, канешне, гэты працэс больш працаглы і не падыходзіць тым, хто хоча хуткі вынік. Новыя саджанцы ў старым садзе не трэба так шчодра паліваць вадой, як пасаджаныя ў чыстым полі: яны абаронены ад засухі, бо тут ужо створаны падыходны мікраклімат, які ўтрымлівае вільгаць.

## «Хочам зрабіць жыццё і працу на сяле прывабнымі для сучасных і будучых пакаленняў»

...Але ў райвыканкаме пакуль не спяшаюцца перадаць сад новым вяскоўцам. Тым не менш яны не страчваюць надзеі і працягваюць клапаціцца пра сад. «Пачынаючы з 2022 года мы не сядзім склаўшы рукі, — кажа **старшыня кааператыва «Цудоўны Сад» Наталля ЮШКЕВІЧ.** — Рэгулярна абкошваем сад, летам мінулага года арганізавалі збор яблыкаў, падчас якога сабралі 42 тоны ўраджаю, тым самым далі магчымасць зарабіць людзям з Валожына і акаляючых вёсак. Склаліся і купілі конную касілку, механічную сокавыціскалку, навучыліся рабіць салодкі сок з антонаўкі, яблычны воцат, упершыню за шмат гадоў пачалі абрэзку сухіх галін на старых дрэвах. Але, для таго каб далей укладвацца ў сад, нам неабходна ўпэўненасць, што мы паўнапраўныя гаспадары гэтай зямлі і можам купляць саджанцы, ствараць у садзе крыніцы, будаваць навесы, лёгкія экалагічныя домікі з прэсаванай саломы на драўляных палях, без фундамента. Бо, пагадзіцеся, які сэнс укладаць у сад свой час, грошы, энергію, калі няма ніякіх гарантый, што яго наогул вырашаць захаваць».

Наталля распавяла, што ў планах кааператыва зрабіць у садзе, між шэрагамі дрэў, музей народнага побыту, як у Строчыцах ці Дудутках. «Мы ўжо і назву прыдумалі — «Сад у стылі Этна-Казкі». Там будуць паказаны прылады працы, народныя рамёствы, песні, праца ў калектыве на практыцы. Плануем арганізоўваць пад адкрытым небам тэматычныя фестывалі без гучнай апаратуры, запрашаць сем'і з горада на выхадныя ў сад вучыцца розным рамёствам. У нашай і ў суседніх вёсках жыве шмат маладых і творчых людзей, якія вырабляюць музычныя інструменты, посуд з гліны і дрэва, мыла ручной работы, экакасметыку, адзенне з лёну, абуты, вітражы. Шмат спецыялістаў па аздараўленні, масажысты, псіхолагі. Плануем іх прыцягваць да майстар-класаў у садзе. Акрамя таго, у нашых планах шмат мерапрыемстваў для дзяцей, будзем вучыць іх рабіць усе неабходныя для жыцця рэчы сваімі рукамі з прыродных матэрыялаў. Гэта будзе арганізавана праз гульні, выкананне заданняў квэста паміж майстар-класамі. Мы клапоцімся аб тым, каб зрабіць жыццё і працу на сяле прывабнымі для сучасных і будучых пакаленняў. Увосень, дарэчы, на Дзень настаўніка да нас у сад на экскурсію прыязджалі прадстаўнікі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

— Мы паехалі паглядзець, як сёння жывуць маладыя людзі, якія пакінулі кватэры ў Мінску, пераехалі жыць у вёску і адраджаюць традыцыі нашых продкаў, — дзеліцца ўражаннямі **куратар групы, загадчыца дзіцячага садка № 209 г. Мінска Таццяна ЦВІРКО.** — Нас пачаставалі мёдам, сабраным у садзе, хлебам на заквасцы і распавялі усе тонкасці яго выпечкі. Прычым цікава, што муку яны не набываюць, а мелюць зерне ўручную на жорнах. Паказалі нам, як выціскаюць яблычны сок на механічнай сокавыціскалцы. Вельмі ўразіла ігра на гуслях і флейтах, зробленых з розных парод дрэва. У сад спецыяльна для нас прывезлі лазню-бочку, і мясцовы жыхар распавядаў пра карысць парэння для здароўя, вучыў правільна вязаць венікі. Мае калегі засталіся пад уражаннем ад паездкі. Ну і, канешне, тое, што маладыя людзі згуртаваліся, каб адрадзіць стары сад, выклікае павагу.

Што ў сада, які яны больш як 60 гадоў таму садзілі сваімі рукамі, з'явіліся «анёлы», радуюцца і старажылы вёскі. Адзін з іх, 80-гадовы Фёдар Паўлоўскі, які ўсё жыццё прапрацаваў аграномам у калгасе, згадвае, што калісьці калгасны сад дагледалі мясцовыя жыхары. На сям'ю давалі па адным-два пралёты. Людзі ўручную касілі траву для корму сваім жывёлам. Па восені ўсёй вёскай збіралі яблыкі і здавалі на завод. Але з кожным годам людзей у вёсцы заставалася ўсё меней і меней. А тыя, што засталіся, пастарэлі і не могуць дагледаць сад...

Мясцовая жыхарка Крысціна расказвала, што яе муж у дзяцінстве ездзіў да бабулі на канікулы, побач быў сад, дзе дзеці гулялі ў хованкі, «казакі-разбойнікі». А потым яго ссеклі. Нехак прыехаў у вёску, а яна сіратліва стаіць сярод поля. «Мы не хочам, каб і ў Вялікім Запруддзі такое паўтарылася, каб наша ўтульная вёсачка засталася ў полі, на скрыжаванні ўсіх вятроў. Сад — гэта не проста яблыкі, з якіх можна зрабіць сок ці пасцілу, гэта ў першую чаргу душа вёскі, куды можны прыйсці, супакоіцца, падумаць аб жыцці, паляжаць у гамаку і пачытаць кнігу. Без яго Вялікае Запруддзе апусцее, страціць штосьці важнае».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота аўтара і з архіва герояў артыкула.**

### Каментарый у тэму

**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Ліхач» (16+).**
**22.45, 23.45 Серыял «БіМ» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 18.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Меладрама «Няхай ідзе снег» (12+).**
**9.05** «Дакументальны экран».
**10.00 Камедыя «Калядны прынц. Каралеўскае вяселле» (12+).**
**11.30 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**12.20 Меладрама «Стажор».**
**14.20 Камедыя «Адзін дома» (12+).**
**16.25 Драма «На Далёкім Усходзе» (16+).**
**18.05 Драма «Карона» (16+).**
**19.50 Трылер «Змова сясцёр Гарві» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.10** «Урокі Лазуркіна».
**21.15** «Надвор'е».
**21.20 Трылер «Містар і місіс Сміт» (16+).**
**23.20** «Беларускія бізнесмены».
**23.50** «Начны серыял».



### Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05** «Усевалад Шылоўскі. Успамінаючы стары МХАТ...»
**7.35, 14.50** Прыступкі цывілізацыі.
**8.30** «Жыццё і лёс».
**8.50, 22.15** «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытуляванай асобы». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30** Навіны культуры.
**10.20** ХХ стагоддзе.
**12.15** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**12.45** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**13.00, 13.20, 13.40** «Порус». Тэлесерыял.
**14.05** Больш, чым каханне.
**15.45** «Энігма».
**16.30** Святыні хрысціянскага свету.
**17.15** Лісты з правінцыі.
**17.45** «Нараджэнне Рускай оперы». Дак. серыял.
**18.15** «Квіток у Вялікі».
**19.00** Урокі рускай.
**19.45** Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка».
**20.50** Раман у камені.
**21.20** Лінія жыцця.
**23.25** «2 Вернік 2».
**0.15** «Сям'я года». Маст. фільм.
**1.50** Шукальнікі.
**2.35** Мультфільм для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**7.00** Маст. фільм «Ключ продкаў» (16+).
**8.30, 9.40, 11.30, 12.45, 15.40, 17.35, 21.40, 23.30, 3.40, 5.25** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
**13.00** Маст. фільм «Мордачка» (16+).
**14.20, 1.10** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**18.00** «Да і пасля...» (16+)
**18.45** Маст. фільм «Гронкі гневу» (16+).
**0.00** «Быў час» (16+).
**1.50** Маст. фільм «Каля самага сіняга мора» (12+).

### EuroSport 1

**3.30, 4.30, 5.00, 8.30, 9.30** Алімпійскія гульні (6+).
**5.30, 10.30, 12.20, 13.55** Фрыстайл. Мужчыны і жанчыны (6+).
**6.30, 7.30, 11.30, 18.15, 23.45** Горныя лыжы. Жанчыны (6+).
**15.30, 16.45** Усе віды спорту (6+).
**15.40, 0.30** Велакрос. Жанчыны.
**16.55, 1.30** Велакрос. Мужчыны.
**18.45** Горныя лыжы (6+).
**19.15, 21.15, 22.15** Зімовыя віды спорту.
**19.30, 22.30, 2.30** Горныя лыжы. Мужчыны.
**21.30** Фрыстайл (6+).

### Кінакамедыя

**1.40** «Дзевяць ярдаў-2» (16+).
**3.25** «Дурдом на колах» (12+).
**5.10** «Starперцы» (16+).
**7.05** «Прытварыся маім мужам» (16+).
**8.55** «Сардэчна запрашаем у сям'ю» (16+).
**11.10** «Пра што гавораць мужчыны. Працяг» (18+).
**13.00** «Шпіён» (18+).
**15.20** «Прытварыся маёй жонкай» (12+).
**17.30** «Небяспечны бізнес» (18+).
**19.30** «Адной левай» (12+).
**21.00** «Салон прыгажосці» (16+).
**23.00** «Аднакласніцы: новы паварот» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.35** «Трывогі першых птушак» (12+).
**10.10** «Паглядзім» (12+).
**10.40, 17.05** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**12.35, 19.05, 1.50** «Сляпая» (16+).
**14.05, 20.05, 3.10** «Варажбітка» (16+).
**15.35** «Знакі лёсу» (16+).
**21.05** «Сем'янін» (16+).
**23.15** «Змрочныя цені» (16+).
**1.10** «Развітанне» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### ТБ1000

**6.20** З любоўю, Розі (16+).
**8.05** Адзін дзень (16+).
**10.10** Іспанская-англійская (16+).
**12.45, 3.05** Выхаду няма (16+).
**14.40, 4.40** Ідэальныя ўцёкі (16+).
**16.40** Госця (16+).
**19.00** Пяты элемент (16+).
**21.30** Эвалюцыя (12+).
**23.25** Забытае (16+).
**1.15** Немагчымае (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Пін-код (6+).
**6.35** Фіксікі (6+).
**7.10** Смяшарыкі (6+).
**7.40** Зялёная карэта (16+).
**9.25** Я іду шукаць (16+).
**11.10** Шматпаявярховік (16+).
**13.00** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**14.50** Пра штo яшчэ гавораць мужчыны (16+).
**16.45** Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
**18.30** Без мяне (16+).
**20.20** Пачаць спачатку (16+).
**22.30** Марафон (12+).
**0.20** Бэндэр: пачатак (16+).
**2.00** Бэндэр: золата імперыі (16+).
**3.20** Бэндэр: апошняя афёра (16+).
**4.55** Як казакі алімпійцамі сталі (6+).
**5.10** Як казакі іншапланецян сустракалі (6+).

### National Geographic

**6.10, 7.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
**7.45, 8.35** Мегазлом (12+).
**9.20, 10.10, 1.35** Асушыць акіян (16+).
**11.00, 11.45, 16.20, 17.05, 17.55, 18.40, 19.25** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
**12.30, 13.15, 20.15, 21.00, 21.45** Ледзяны патруль (16+).
**14.05, 14.50, 15.35, 2.25, 3.10, 3.55, 4.40** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**22.30, 23.15** Злавіць кантрабандыста (16+).
**0.05, 0.50** Індустрыя наркотыкаў (16+).
**5.25** Навуковыя глупствы (16+).

### ЯСНАе

**5.20** Серыял «Крык савы» (16+).
**7.05** Серыял «Дзяржаўная граніца. «Афганскі капкан» (12+).
**8.50** «Ясна аб міні-футболе».
**9.20** Серыял «Іншы маёр Сакалоў» (16+).
**10.55** Маст. фільм «Мафія бессмяротная» (12+).
**12.25** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (16+).
**14.10** Маст. фільм «Лета. 1941» (16+).
**16.00** Серыял «САХР» (16+)
**17.35** Маст. фільм «Я — лялька» (16+).
**19.20** Серыял «Пазыўны «Зграя»-2» (16+).
**21.00** «Час высокіх тэхналогій».
**21.25** Маст. фільм «Рысь» (16+).
**23.05** Маст. фільм «Таямніца пячаткі дракона» (6+).
**1.05** Маст. фільм «Скіф» (18+).
**2.50** Маст. фільм «Прафесіянал» (12+).
**4.50** Маст. фільм «Зоя» (16+).

### ЗВЯЗДА

**6.00, 2.45** «Трасцянец. Алея смерці». Дак. фільм (12+).
**6.30, 3.15** «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 13.20** «Сакрэтны фарватэр». Маст. фільм (12+).
**8.30, 21.35** «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+).
**9.50, 10.40** «Чорная кошка» (16+).
**11.30, 12.25** «Мемарандум Парвуса» (16+).
**14.35, 15.20** «1942-і» (16+).
**16.05** «Попел Хатыні. Боль без тэрміну даўнасці». Дак. фільм (12+).
**17.20** «Рэйкавая вайна». Дак. фільм (12+).
**17.45, 18.35, 19.50, 20.40** «Наркамаўскі абоз» (16+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме». Агляд вайсковых падзей.
**22.45** «Паміж мірам і вайной. Якія ідуць у неба». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Фаня Алер. Вайна без антракта». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Заложнік «Сатурна». Без права быць сабой». Дак. фільм (12+).
**0.45** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Ілжэпартызаны. Па легендзе Абвера». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Доктар Слон. Стаўка на чырвонае». Дак. фільм (12+).
**2.15** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**3.45** «Брэсцкая крэпасць. Невядомая абарона». Дак. фільм (12+).
**4.15** «Бітва за Кобрын. Заложнікі сакрэтнага пакта». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**9.55, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Калі-небудзь надыдзе заўтра-2» (16+).**
**10.55, 0.10** «Скажынемаўчы».
**14.50, 20.45** «Фактар.BY».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «След» (16+).**
**17.05, 18.40, 19.20 Меладрама «Запалярны вальс» (12+).**
**18.15** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**20.00** Панарама.
**23.55** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05** «Сляпая». Дак. драма (16+).
**10.35 Дэтэктыў «Свае» (16+).**
**12.05** У дэкрэце (16+).
**12.35 Дэтэктыў «Спаская» (16+).**
**14.30** «Абмен дамамі» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Карысная праграма» (16+).
**17.15** «Кароль дэсертаў. Кубак Агзамава» (12+).
**18.30** Гэта мая сям'я (12+).
**19.45** «Азбука Уральскіх Пельменяў» (16+).
**21.10** Спартлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Драма «Імператрыца Кі» (16+).**
**23.40 Драма «Сонечная лінія» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 15.35, 20.30, 22.35** «Навіны культуры».
**8.15, 18.40 «Жуpавель у небе». Маст. фільм (16+).**
**10.00, 18.35** «Асобы».
**10.10 «Прыступіць да ліквідацыі». Маст. фільм (12+).**
**13.05** «Веды ў кубе».
**13.45, 21.05 «Мой любімы клоўн». Маст. фільм (12+).**
**15.10** «Жывая спадчына».
**15.45** «Сіла веры».
**16.10 «Той самы Мюнхгаўзен». Маст. фільм (6+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.45** «Легенды эстрады».
**23.30** «Культурнае падарожжа» (6+).

## Беларусь 5

**6.55, 11.30** Баскетбол. Жанчыны.
**8.45** Хакей для ўсіх.
**9.20, 14.00, 17.00** Тэніс.
**13.40** Планета спорту.
**16.00, 22.00** Змешаныя адзінаборствы.
**19.05** Піт-стоп.
**19.20** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама-Мінск». У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.50** «Спорт-цэнтр».

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Маё роднае. Адпачынак» (12+).
**12.30, 13.15, 22.55 Фільм «І шарык вернецца» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Народны ДАСТ» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**19.00** Інфармацыйны канал (16+).
**20.00, 0.45** Час.
**21.15** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.25** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі» (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект. Без падману (16+).
**10.40 «Феміда бачыць». Серыял (16+).**
**11.40** Дак. праект. Таемная гісторыя ежы (16+).
**13.50 «Па той бок смерці-2». Серыял (16+).**
**15.45** Дак. праект. Неверагодная навука (16+).
**16.50** «Рашэнне ёсць. Дэпутацкі адказ».
**17.20** Дак. праект. Уся праўда (16+).
**17.40 «Спецбат». Серыял (16+).**
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40** «Крокі Незалежнасці».
**20.55 «Неўскі. Праверка на трываласць». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.50 «Вакальна-крымінальны ансамбль». Серыял (16+).**

## МІР

**5.00 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**7.00, 0.45** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**7.55, 11.00, 14.10, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**8.50, 11.55, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**10.10, 13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**17.35** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат» (16+).**
**21.15 Маст. фільм «Дзяўчына без адраса» (16+).**
**23.05 Маст. фільм «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-Біч зноў ідуць дажджы» (16+).**
**2.00 Маст. фільм «Блізняты» (16+).**
**3.25 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**10.05 Серыял «Тайны следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Марозава» (16+).**
**18.45** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Родная кроў» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.00, 8.20, 13.20, 22.50, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.15** Гісторыі выратавання (12+).
**7.50** Беларуская супержанчына.
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10 Баявік «Марскія д' яблы. Смерч» (16+).**
**10.35** Спецыяльны рэпартаж АТН (12+).
**11.05 Серыял «Гастралёры» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «ДНК» (16+).
**15.00** «Чакай мяне» (12+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.55 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.50 Серыял «Ліхач» (16+).**
**21.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**22.55, 23.45 Серыял «БіМ» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 21.10** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад «Калядныя смурфікі» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35** «Бум» (12+).
**9.25** «Дакументальны экран».
**10.15 Камедыя «12 калядных спатканняў» (12+).**
**11.40 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**12.30 Фантастыка «Валерыян і горад тысячы планет» (12+).**
**14.45** «Любімае кіно».
**17.00, 18.55** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.05 Драма «Карона» (16+).**
**19.00 Трылер «Змова сясцёр Гарві» (16+).**
**21.00** «Вечарніца» (0+).
**21.15** «Урокі Лазуркіна».
**21.20 Прыгоды «Доўгі пацалунак на ноч» (16+).**
**23.20** «Начны серыял».



## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05** «Усевалад Шылоўскі. Успамінаючы старыя МХАТ...»
**7.35, 14.50** Прыступкі цывілізацыі.
**8.30** «Жыццё і лёс».
**8.50, 22.15** «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытуляванай асобы». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** ХХ стагоддзе.
**12.10** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00, 13.20, 13.40, 23.55, 0.15, 0.35** «Порус». Тэлесерыял.
**14.05** Штучны адбор.
**15.45** «Белая студыя».
**16.30** Святыні хрысціянскага свету. «Цярновы вянок». Аўтарскі фільм мітрапаліта Іларыёна (Алфеева).
**17.15** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**17.45** «Нараджэнне Рускай оперы». Дак. серыял.
**18.15** «Антон Макаранка. Супраціўленне асобы». Дак. фільм.
**19.00** Урокі рускай.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Абсалютны слых».
**21.30** Больш, чым каханне.
**23.20** «Гісторыя рускіх шлюбаў». Дак. серыял.
**1.50** Рускія ў сусветнай культуры.
**2.30** Раман у камені.

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**6.55** Маст. фільм «Лэдзі знікае» (16+).
**8.30** Дак. фільм «Рассакрэчаныя матэрыялы. Першая атамная бомба СССР» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.30, 15.40, 17.25, 20.30, 21.40, 23.30, 1.50, 2.50, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.10, 2.10** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**13.50** Маст. фільм «Каля самага сіняга мора» (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.00** Маст. фільм «Ключ продкаў» (16+).
**23.45** «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Мы з Урала» (16+).
**1.15** «Каралі эпізоду» (16+).

## EuroSport 1

**3.00, 14.00** Горныя лыжы. Мужчыны (6+).
**3.30, 5.00, 5.30, 10.30, 11.30, 12.00, 15.30, 16.30, 2.00** Біятлон. Мужчыны (6+).
**6.00, 7.00, 8.00** Парусны спорт (6+).
**9.00, 18.30** Снукер (6+).
**12.30** Горныя лыжы. Жанчыны (6+).
**17.30** Аўтагонкі на вынослівасць (6+).
**19.45, 20.00** Алімпійскія гульні (6+).
**22.00, 23.00** Сімрэйсінг.
**0.00** Каратэ (6+).
**1.00** Конны спорт (6+).

## Кінакамедыя

**1.05** «Supeгнянь» (16+).
**2.35** «Думай, як мужчына» (12+).
**4.35** «Норт» (12+).
**6.00** «Дзевяць ярдаў-2» (16+).
**7.50** «Больш, чым сябар» (16+).
**9.45** «Шпіён» (18+).
**12.00, 19.30** «Пра што гавораць мужчыны» (18+).
**13.50** «Белыя цыпачкі» (12+).
**15.50** «Прытварыся маім мужам» (16+).
**17.40** «Кароль вечарынак» (16+).
**21.15** «Вясельны перапалох» (16+).
**23.10** «Starперцы» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.45** «Містычныя гісторыі» (16+).
**9.40, 15.50** «Стой! Не тое маці будзе вараждыць» (16+).
**10.40, 4.10** «Глядзі сам» (16+).
**11.00, 16.50** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**12.55, 18.50** «Сляпая» (16+).
**14.20, 20.15, 3.00** «Варажбітка» (16+).
**21.45** «Справы жыццёвыя» (16+).
**23.25** «Агенцтва О.К.О.» (16+).
**0.20** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.15** «Малена» (16+).
**3.30** «Паляванне на маньяка» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.55** Прывідны патруль (12+).
**7.30** Людзі ў чорным (12+).
**9.25** Людзі ў чорным-2 (12+).
**11.05** Людзі ў чорным-3 (12+).
**13.05** Турыст (16+).
**15.05** Таемнае акно (16+).
**17.00** Акадэмія вампіраў (16+).
**19.00** Паляўнічыя на прывідаў (12+).
**21.05** Паляўнічыя на прывідаў-2 (12+).
**23.10** Рэальныя крывасмокі (16+).
**0.50** Ноч у краме жахаў (12+).
**2.05** Візантыя (16+).
**3.55** Версальскі раман (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Пін-код (6+).
**6.50** Фіксікі (6+).
**7.45** Смяшарыкі (6+).
**8.35, 2.55** Цень зоркі (16+).
**10.15** Рубеж (12+).
**12.00** Напарнік (12+).
**13.45** Прывід (6+).
**15.55** Хлопец з нашых могілак (12+).
**17.30** Бэндэр: пачатак (16+).
**19.25** Бэндэр: золата імперыі (16+).
**21.00** Бэндэр: апошняя афёра (16+).
**22.55** Белы снег (6+).
**1.15** З пяці да сямі (16+).
**4.20** Залатая антылопа (6+).
**4.50** Царэўна-жабка (6+).

## National Geographic

**6.10, 7.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
**7.50, 8.40** Мегазлом (16+).
**9.30, 10.15, 20.15, 21.00, 21.45, 1.35** Асушыць акіян (16+).
**11.05, 11.50, 12.35, 13.20, 16.25, 17.10, 17.55, 18.45, 19.30** Суперкар са звалкі (16+).
**14.10, 14.55, 15.40, 2.20, 3.10, 3.55, 4.40** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**22.30, 23.15** Злавіць кантрабандыста (16+).
**0.00, 0.50** Індустрыя наркотыкаў (16+).
**5.25** Навуковыя глупствы (16+).

## ЯСНАе

**4.20** Серыял «Крот» (16+).
**6.05** Серыял «Дзяржаўная граніца. «Салёны вецер» (12+).
**8.20** «Раніца ЯСНАЯ».
**9.25** Серыял «Іншы маёр Сакалоў» (16+).
**11.05** Серыял «Аб'яўлены ў вышук» (12+).
**12.40** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (16+).
**14.20** Маст. фільм «Чорны сабака. Апяраджвальны ўдар» (16+).
**16.10** Серыял «САХР» (16+).
**17.50** Серыял «Група Zeta-2» (16+).
**19.25** Серыял «Пазыўны «Зграя» (16+).
**21.00** Дакументальны цыкл «Сувязісты».
**21.25** Маст. фільм «Свая вайна» (16+).
**23.05** Маст. фільм «Чаклун і Румба» (12+).
**0.30** Маст. фільм «Знак бяды» (12+).
**3.00** Маст. фільм «Справа для сапраўдных мужчын» (12+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Бітва за Кобрын. Заложнікі сакрэтнага пакта». Дак. фільм (12+).
**6.30, 2.45** «Вайна разведак. Курсанты асаблівага прызначэння». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 13.10** «Сакрэтны фарватар». Маст. фільм (12+).
**8.30, 21.40** «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+).
**9.40, 10.30, 17.50, 18.40** «Чорная кошка» (16+).
**11.20, 12.15, 19.50, 20.45** «Мемарандум Парвуса» (16+).
**14.20, 15.05** «1942-і». Серыял (16+).
**15.50, 23.20** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**16.45, 3.45** «Па плане «Д». Як пачыналася сакрэтная вайна». Дак. фільм (12+).
**17.15, 4.15** «22 чэрвеня. Самы доўгі дзень». Дак. фільм (12+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме». Агляд вайсковых падзей.
**0.15** «Шпіён з-пад Вілейкі». Дак. фільм (12+).
**0.45** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Контрразведка. Рассакрэчаны фронт». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## ЯКАЯ ПЕСНЯ БЕЗ БАЯНА... а шуба — без селядца?

Гэтую гісторыю мне расказаў знаёмец, які да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС жыў на Магілёўшчыне. Бажыўся, што праўда, што так і было: у іхнім гэпэ, маўляў, кожны пацвердзіць!.. Далей — з яго слоў:

На пачатку снежня Міхась Пятровіч (назавём яго так) спраўляў юбілей і чакаў гасцей: дваццаць чалавек прыйсці збіраліся... Каб прыняць ды як след пачаставаць, сужэнцы загадзя купілі ўсё; хіба па селядцы жонка адправіла напярэдадні.

— Ідзі, — сказала Міхасю, — і без іх не вяртайся! Бо якое ж свята без шубы?

— Ды куплю, чаго там, — адмахнуўся муж. — Гэта ж не мандарыны пад ёлку. Зайшоў у свае «Прадукты».

У іх, найбліжэйшых, і кілька была, і марожаны хек з «кампаніяй», і вэнджаная скумбрыя — селядцоў — ніякіх.

Такой бяды, падумаў Міхась — крутнуся ў краму на Савецкай.

Але і там яго чакала расчараванне: селядцы разабралі.

Пасля гэтага ён яшчэ тры крамы аббег і... з пустымі рукамі выйшаў. У роспачы на чацвёртым ганку стаяў, гадаючы, куды ж падацца, як раптам бачыць — міма яго мужчына ідзе, у празрыстым пакеце селядцы нясе: аж тры штукі, ды вялікія, тлустыя.

— Прабач, даражэнькі! Скажы, дзе купіў? — папытаўся Пятровіч.

— Ды вось тут, недалёчка — у аптэцы.

— А з чаго б там селядцы сталі прадаваць? — здзівіўся Міхась.

— Ды я і сам падумаў... Па таблеткі зайшоў. Аж чую — кажуць, што рыбін тлушч завезлі, і памыліўся там нехта: у трох бочачках — селядцы аказаліся. Дык не адпраўляць жа назад? Прадаюць...

Хвілін праз колькі Міхась ужо быў у аптэцы.

— Мне селядцоў, — сказаў маладзіцы ў белым халаціку.

— Чаго?! — перапытала тая, здзівіўшыся.

— Ды селядцоў. Тры кілаграмы, — удакладніў Міхась.

— А вы, прабачце, дзверы не зблыталі? Тут аптэка.

— Дык кажуць жа, што вам прывезлі...

— А вы болей слухайце! — параіла дзяўчына адступіўшы ад акенца: усё, маўляў, размова скончана.

Што было рабіць? Міхась падаўся на вуліцу і зноўку стаў разважаць: ну быць жа таго не можа, каб з трох бочачак ды ўсё разабралі! Добры прадукт — няйначай для сябе прыхавалі, для сваіх... Але ж і я не адступлюся!

З рашучым выглядам Міхась вярнуўся ў аптэку.

— Мне б хоць парачку, — дабром папрасіў у дзяўчыны. — Два селядчыкі. Жонка сказала, што без іх дадому не пусціць.

— Вы што — хворы? на галаву? — не вытрывала аптэкарка (на голас з правізарскай выйшлі яшчэ дзве жанчыны). Няма ў нас селядцоў!..

— Значыць, былі такі! — узарваўся гневам Міхась. — Дайце мне кнігу скаргаў!

Дзяўчына, цяжка ўздыхнуўшы, дастала аднекуль акуратны прашнураваны сшытак, падала. Папрасіла яшчэ:

— Толькі разборліва пішыце. І поўнасцю — прозвішча, імя, імя па бацьку, хатні адрас, нумар тэлефона...

— Гэта навошта? — насцярожыўся Міхась.

— А каб усе тут ведалі, дзе дурняў шукаць.

Міхась разгублена залыпаў вачыма, потым шпурнуў на прылавак кнігу і рушыў з аптэкі на вуліцу.

...Толькі потым ён, бедны, даведаўся, што таму шчаслівчыку селядцы прывезла сваячка з Мінска.

А пра рыбін тлушч ён так проста ляпнуў: не думаў, што жарт нехта прыме ўсур'ёз.

**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*

## У ТРОХ СОСНАХ, альбо Жанчына... Мужчына... Блуканне...

*Цягнуўся вечар*
*снежанькі паволі,*
*Ля цёплай печкі*
*кот гуляў з клубком.*
*Сяброўкі*
*аб сваёй няпростай долі*
*Вялі дэбаты*
*ў кухні*
*за чайком.*

*— Не перадаць,*
*які мой лёс паганы,*
*Як шкода мне*
*жанчынак тых,*
*Чый гаспадар*
*штодня прыходзіць п'яны,*
*Як мой...*
*Бо мой якраз з такіх!*

*Па вёсцы ўчора*
*цэлы дзень бадзяўся,*
*«Шарманку»*
*разам з Баскавым спяваў,*
*Дадому*
*на рагах прыцеляпаўся,*
*Замест дзяцей*
*сабаку цалаваў.*
*Вось так жыву, —*
*слязу пусціла Дарка.*
*— Ты, дарагая,*
*Богу не грашы:*
*Твой хоць і п'е,*
*ды пыніць гаспадарку.*
*А мой жа, труцень,*
*дзень пры дні*
*ляжыць!*
*Адзін занятак —*
*будзень, выхадныя:*
*У разетку целік —*
*і пад шум заснуў.*
*Заплыўшы тлушчам*
*і жывот, і шыя,*
*А я ж*
*дык, гляньце,*
*ногі ледзь цягну!*

*І не падняць яго —*
*ну колькі ні сварыся!*
*Я, мусіць, хутка*
*на развод падам, —*
*Расчырванелая,*
*кіпіць Марыся.*

*— А я, сяброўкі,*
*мо і зайздрошчу вам?*
*Якія ёсць,*
*мужы пры вас заўсёды, —*
*З душы Таццяны*
*рвецца яе боль.*
*— Майму ж —*
*хоць трошкі —*
*нейкай дай свабоды —*
*Папрэцца за спадніцаю*
*любой!*
*Такі залётнік,*
*бабнік, валацуга,*
*Не зломак, праўда,*
*лішняга не п'е,*
*Але штодня:*
*«Дзе быў?» —*
*«Зайшоў да друга»*
*Ці пра начальства*
*нешта мне вярзе...*

*— Ты тройчы*
*замужам была, Ірына!*
*Каб мы тут*
*не спрачаліся дарма,*
*Скажы:*
*які найгорш мужчына?*
*— Найгорш?*
*Калі ніякага няма.*

**Алена Несцяронак,**
*г. Докшыцы.*

## ПРАЦСЕЙ ТРЭБА БЫЦЬ, альбо Не спяшайся лезці «ў бутырку»

Не ведаю, як у іншых лазнях, а ў нашай — на вуліцы Савецкай — шмат аматараў не толькі адхвастаць сябе дубовым ці бярозавым венічкам, але і пасядзець затым у асобным памяшканні — аддыхацца, пагаварыць...

Палітыка, спорт, машыны, дарогі, дактары і хваробы, жонкі ды цешчы, палюбоўнікі і палюбоўніцы...

— Браткі мае, — мовіў неяк шчуплы мужчынка, абкладаючы лысіну кляновым лісцем, — паслухайце, што нам раіў паэт Кірэенка:

*Цалуйцеся, людзі, часцей,*
*Не адкладайце галубіцца,*
*Будзьце працей,*
*будзьце працей...*
*Пакуль любіцца.*

— Дык ён жа праўду сказаў: трэба!.. Як там — гуляць-галубіцца? — зарагатаў аж сіні ад татуіровак здыхлік, што сядзеў паблізу.

— Не, ты пачакай, — перапыніў яго малады вусач. — У мяне тут пытанне: ну вось мы, мужчыны, можам кінуцца ў любошчы — нам пофіг... Лафа... А калі і жонкі за намі ўслед? Што тады?

— А нічога, — азваўся «кляновік». — Паэт жа сказаў: будзьце працей! Значыць, не трэба раўнаваць ды рваць сабе нервы.

— Лёгка сказаць, — хмыкнуў вусач. — Можна падумаць, што ты спрабаваў?

— А як жа! — смела кінуў бывалы. — Ну вось паслухайце: нядаўна зусім прыходжу я вечарам з работы, ціхенька адмыкаю дзверы, бачу — туфлі ў вітальні стаяць 45 памеру... Чую — музыка ў зале грае, усоўваю нос і... Што я бачу?!

— Карацей, Скліфасоўскі!

— ...Бачу нейкага бамбізу ў ручніку, якому жонка працягвае порткі.

— А ты што? — занерваваўся здыхляк з татуіроўкамі.

— Я?.. Прывітаўся...

— Дык жа цюфяк! Мяшок з саломай!

— А яны? — дапытвала публіка.

— Адказалі...

— Ды стопудовы цюфяк!.. Я б за нож — адразу!

— Сціхні, Атэла недароблены! — спыніў яго вусач. — Не гані крымінальную хвалю.

— А што далей? — з алімпійскім спакоем працягваў той. — Жонка спытала, як справы ў мяне, ці не галодны? Бамбіза паклаў ёй грошы на стол...

— А ты?! Спусціў на тармазах? Няўжо?! — не разумела публіка.

— Ну не ў бойку ж мне лезці, калі ў яго кулак, як мая галава!.. Да таго ж я згодзен з паэтам: «Будзьце працей».

— Ага... Можа, пляшку пастаўце хахалю?

— Дык я ж і паставіў, — усміхнуўся расказчык. — Бо гэта мой таварыш быў. Прахадзіў каля нашага дома — нейкі дварняк прывязаўся: порткі знізу парваў. А мая ж Ніначка — швачка, якіх пашукаць! Да яе паўгорада ходзіць: маладыя, каб джынсы «парваць», а старыя — каб неяк залатаць. Вось і таварыш...

Ну што казаць: разыграў «кляновік» кампанію — насмяшыў!

А камусьці, можа, і падказаў: калі хочаш жыць на свабодзе, не трэба спяшацца — хапацца за нож ды лезці «ў бутырку».

**Уладзімір Пернікаў,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.**

***Напрыканцы года (і не толькі гэтага) чытачы звычайна цікавяцца, ці не парвецца «звяздоўскі провад» — ці будзе выходзіць «Народ»? І як? Штотыдзень па пятніцах?***

***Сустрэчнае пытанне: а як бы спадарству хацелася?***

***Каб выходзіў?.. А радзей ці часцей?***

***Калі так — пішыце! Іншых спосабаў захаваць любімую рубрыку проста няма.***

***З надыходзячым!***

Неасабісты суб'ектыў



# Пісьмо Дзеду Марозу

### Як папрасіць у яго адчуванне свята?

ПІСЬМО Дзеду Марозу я знайшла... у супермаркеце, які спецыялізуецца на продажы будаўнічых матэрыялаў. Там сярод процьмы шпалераў, ламінату, сантэхнікі перад святамі цэлы аддзел выдзелілі пад навагодні «рыштунак». На стэндзе побач з калядными вянкамі і пасярэбранымі галінкамі яно і вісела. Дакладней, яны. Іх было некалькі: ад таннейшых, на простай альбомнай паперы, да дарагіх — на кардоне, з бліскучымі літарамі. Сэнс адзін і той жа і ў духу нашага шалёнага часу: малому аўтару пісьма трэба ўпісаць толькі сваё імя і просьбу, што падарыць. Усё астатняе — і «Дарагі Дзед Мароз», і нават «Увесь год я была паслухмянай дзяўчынкай (ці паслухмяным хлопчыкам, прадаюцца розныя варыянты)» — ужо аддрукавана-напісана прыгожым курсівам... Бацькі бралі гэтыя «пісьмы» з ахвотай: цана пытання — некалькі рублёў, затое адразу атрымаеш ад нашчадка і радасць ад такога прыгожага пісьма, якое і пісаць не трэба, а ўсё роўна нібыта сам напісаў, і заяўку на навагодні падарунак.

Я таксама ўжо працягнула было руку да гэтых пісьмаў, каб купіць малым (уявіла, якое б было літаральна парасячае захапленне ў мяне, калі б такі цуд мне прынеслі на пачатку 80-х мінулага стагоддзя), але перадумала. Па-першае, няхай пішуць самі. Хай сабе і з памылкамі, і з калякамі-малякамі. Бо і так пішуць рукой усё менш і менш, асабліва калі асвояць клавіятуру тэлефона і камп'ютара. Па-другое, ёсць у гэтых гатовых пісьмах штосьці штучнае, няшчырае. Як, дарэчы, і ва ўсёй гэтай катавасіі з заяўкамі Дзеду Марозу і з падарункамі нібыта ад яго імя. Нібыта ў інтэрнэт-краме штосьці купляеш: «Заказ аформлены, дастаўка будзе 31.12»...

ХТОСЬЦІ запярэчыць: павінна ж у дзіцяці быць адчуванне чараўніцтва і казкі на Новы год. Згодна, больш за тое, як па мне, дык гэтае ж адчуванне павінна быць і ў дарослых. Але, прызнайцеся шчыра, ці з'яўляецца яно ў вас, калі з выпучанымі вачыма лётаеце па крамах (як варыянт — носіцеся па прасторах анлайн-гандлю) у пошуках «тых самых» робата, машынкі, лялькі, якія ваша дзіця (ці ўнук або ўнучка — тут увогуле цяжкі выпадак, бо як гэта — каб дзядуля ці бабуля не выканалі просьбу) заказала Дзеду Марозу. Вы адчуваеце сябе тым самым Дзедам Марозам, казачным чараўніком? Ці хутчэй замучаным чалавекам, якому, акрамя іншых жыццёвых турбот, яшчэ і гэтая на галаву звалілася? Бо калі машынка будзе не таго колеру, а на лялцы сукенка не таго фасону — гэта ж можа атрымацца не свята, а скандал з боку «заяўніка». Бо Дзед Мароз не можа памыляцца!

Я, магчыма, тут трохі гратэску і дадала, але перакананая, што сутнасць перадала дакладна. А яшчэ вось што самае галоўнае ва ўсім гэтым «спічы» — ці не адкупляемся мы такім чынам ад дзіцяці: падарунак ад Дзеда Мароза купіў — заяўка выканана. Што яшчэ больш трэба?

У кожнага, канешне, свой уласны досвед. Я вось, напрыклад, ніколі ў Дзеда Мароза не верыла, дый старэйшыя мне ўсіх гэтых баек пра падарункі, якія невядома адкуль з'яўляюцца навагодняй раніцай — пры ўмове добрых паводзін, канешне ж, — не расказвалі. Гэты самы навагодні Дзед заўсёды быў проста набітай ватай цацкай, якую ставілі пад ёлкай, ды пераапранутым старшакласнікам у школе, ці вадзіцелем дзядзькам Іванам («калгасны» Дзед Мароз прыязджаў у вёску, атабарваўся ў чыёй-небудзь хаце, мы яму чыталі вершыкі, а ён даваў нам падарункі, у якіх кожны год былі нязменныя вельмі смачныя цукеркі «Тузік»). Але адчуванне цуду і чараўніцтва — было, дый яшчэ якое!

Яно было ў заснежанай змерзлай ялінцы, якую бацька прыносіў з лесу, і яна, пакрысе адтаючы, напаўняла хату фантастычным водарам свята. Яно было ў старым, з абабітымі жалезам вугламі чамадане, у якім ляжалі ёлачныя цацкі, — мне дазвалялася іх выкласці радкамі на канапу, а ўжо пасля з бацькамі мы вешалі іх на галінкі. Яно было нават у вялізных бацькавых валёнках — ён іх абуваў толькі, калі ішоў па елку, і яны таксама былі нязменным святочным атрыбутам. Яно — і гэта самае галоўнае — было ў мітусні 31-га чысла, калі хтосьці прыязджаў, кагосьці чакалі, бывала, дарогу замятала, і тады бацька запрагаў каня і ехаў сустракаць кагосьці з вячэрняга аўтобуса — на Новы год, паводле няпісанага правіла, павінна была сабрацца ўся сям'я. А яшчэ прыходзілі стрыечныя, кумы, сваты — у вёсцы ж радні хапае. І ў гэтым гармідары было так здорава, дзецям дазвалялася бегаць па хаце, раскладваць на вялікім рассунутым стале відэльцы, расстаўляць талеркі і шклянкі, вылізваць слоічкі з-пад маянэзу (хто каштаваў той маянэз, ведае, якая гэта смаката). За сталом віншаваліся, гаманілі і спявалі, і дзецям ніхто не загадваў ісці спаць, «бо ўжо позна», і можна было запальваць бенгальскія агні і есці мандарыны, якія ў вясковай хаце з'яўляліся толькі на Новы год. А потым ішлі праводзіць па дамах гасцей, і гулялі ў снежкі, і качаліся ў гурбах, не толькі дзеці, але і дарослыя, і не таму што п'яныя, а таму што свята і весела... А на наступныя дні чараўніцтва працягвалася, бо паштальёнка цётка Надзя ў сваёй пузатай сумцы прыносіла паштоўкі — цэлымі пачкамі, іх дасылалі далёкія і блізкія сваякі, сябры, знаёмыя адусюль — і з Усць-Каменагорска, і з суседняй вёскі. Яны былі вільготныя ад снегу і пахлі сіверам, з іх я рабіла «выставу» — раскладвала і расстаўляла ў зале на канапе, і хутка сесці на ёй ужо не было дзе...

А як жа падарункі, спытаеце? Пару пакункаў з цукеркамі, што давалі бацькам на працы. Бацькаў — страхавога агента — быў багацейшы, туды сыпалі нават жменю «марскіх каменьчыкаў», мамін — настаўніцкі — больш бюджэтны, але затое там была салодкая плітка з кракадзілам Генам на абгортцы — амаль шакалад...

ТОЛЬКІ не ў іх, не ў падарунках — няважна ад каго, ад таты з мамай ці ад самога Дзеда Мароза — было для дзіцяці тое свята. Яно, напэўна, і сёння так застаецца. Вось пра гэта, уласна, і хацела сказаць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

Организатор аукциона –

**РУП «Белтелеком»**
**в лице Брестского филиала,**

расположенного по адресу:
г. Брест, пр-т Машерова, 21-2.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

**Лот 1.**
**Помещение со вспомогательной площадью (тамбур) на 1-м этаже в капитальном строении, здании подстанции**

**общей площадью 68,1 кв. м, в м-не Тексер в г. Барановичи Брестской области:**

1.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1БАВ * 0,25 * 68,1 = 17,025 БАВ.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п. 7.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 16.05.2023 № 138; коэффициент – 3,0, целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли

**Аукцион состоится 16 января 2024 года в 14.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком»**

**Документы на участие в аукционе принимаются с 15 декабря 2023 года по 15 января 2024 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2, каб. № 416**

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

- перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB30121001100011000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC) AKBBBY2X, УНП 201003265;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

**Помимо указанных документов:**

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Победителем аукциона признается участник**, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона** (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан:**

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин .

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок: (8-0162) 22-10-20,тел./факс 22-15-42.**

---

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: ***«Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» ф. 2РН, 2РП серии БИ* № 1862304 – 1 шт.**

УНП 100782388

---

Утерянные страховые свидетельства внутреннего страхования (ОСГО ВТС) ЗАСО «Белнефтестрах» МА 7632245 и ТА 1225263 **считать недействительными.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00005** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** Учреждение образования «Молодечненский торгово-экономический колледж» Белкоопсоюза, 222310, Минская обл., г. Молодечно, пл. Центральная, 1, тел. 8 (0176) 777569.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by

**Дата и время проведения повторных электронных торгов 08 января 2024 г. в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

